**Тачыцкая Н.А., Тачыцкая Г.К., Талайка В.І. (Мядзел)**

**“І ва ўсіх нас ёсць Радзіма…”**

Ёсць у прыродзе загадкавая пара – восень. У ёй – непаўторная паэзія ад апошніх праяў хмельнага летняга жыцця, і лірычная песня ад курлыкання крылатых вандроўнікаў-журавоў, і светлая радасць ад някідкай прыгажосці квітнеючых вяргіняў і астраў, і журботны настрой ад лістка, які павольна цёплым агеньчыкам апускаецца на зямлю. Адкуль ён, гэты шчымлівы неспакой жоўтай восені? Ён не толькі ў штодзённых клопатах імклівага школьнага жыцця, але і ў чаканні незвычайнага дня – 17 верасня. У гэты дзень Максіму Танку, імя якога з гонарам носіць наша школа, спаўняецца 100 год.

На працягу многіх год вучні нашай школы прымаюць удзел у навукова-практычных канферэнцыях з даследаваннямі жыцця і творчасці Максіма Танка: “Дайсці да Максіма Танка”, “Ёсць адна песня песняў – пра Радзіму”, “Вобраз малой радзімы ў творчасці Максіма Танка”, “І ва ўсіх нас ёсць Радзіма: турыстычны маршрут па малой радзіме земляка”. Уся работа ў школе па ўшанаванні памяці Максіма Танка рэалізуецца ў рамках педагагічнага праекта “Дарога да Максіма Танка”. Жыццёвы і творчы шлях Максіма Танка вывучаецца не толькі па падручніках, але і ў паходах, вандроўках, у час сустрэч з людзьмі, якія ведалі яго. Вынікам гэтых вандровак стала распрацоўка турыстычнага маршруту па малой радзіме земляка “Сцяжынкамі Максіма Танка”. Наведванне гуртка “Музеязнаўства” дало магчымасць судакрануцца з дакументамі, фотаздымкамі, экспанатамі, якія адкрывалі невядомыя старонкі біяграфіі паэта.

Максім Танк... Чалавек з вялікай літары – мудры, верны, чулы, сардэчны, просты. Магутны волат паэтычнага свету – адметны, таленавіты і непаўторны. Ён пісаў пра ўсё. У яго вершах – эпахальныя падзеі і жыццёвыя змаганні, замалёўкі з бясконцых падарожжаў і трапныя партрэты, лёгкія афарызмы; дасціпны гумар і вывераная філасофія. У яго вершах – заўсёды песня жыцця. Але з усіх песняў ёсць адна, галоўная – “песня пра Радзіму”. Дзе ж вытокі гэтай песні, яго сілы, карані яго мудрасці і чалавечнасці? Сам Яўген Іванавіч на гэтае пытанне даваў такі адказ: “Самыя светлыя, самыя лепшыя вершы знаходзіў я на роднай зямлі”. І сапраўды, пра што б ні гаварыў паэт, у якія далечы ні сягала б яго натхненне, ён ніколі не забываўся пра той самы дарагі і запаветны край, дзе “сэрца званчэйшыя песні вядзе”. Ён раз за разам вяртаўся да родных вытокаў, да “бацькоўскай прызбы з шэрых валуноў”, да мілых сэрцу пількаўскіх мясцін, адкуль пачалася жыцця дарога.

Пра яе, Радзіму, Максім Танк пісаў: “Радзіма – самае дарагое ў жыцці чалавека. Без яе ты быў бы засмучаны і ў дні гора, і ў дні радасці; без яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сіратой быў бы ты на свеце; без яе і песня – толькі гук без рэха і наш прытулак – якім бы ён ні быў – гняздо бяздомнай птушкі”. Ён рос у такой сям’і, дзе нікому і ў галаву не прыходзіла выракацца свайго – мовы, звычак, спаконвечнай любві да зямлі, роднага кутка.

Стаю ля хаціны старой,
У якой было:
Больш нараканняў на жыццё,
Як самога жыцця,
Больш дыму лучыны,
Як святла,
Больш едакоў,
Як лыжак… [2, с. 317]

Паэт не цураецца сваёй курнай хаты, бо ведае, што яе жыхары варты самага глыбокага ўвасаблення, паэтызацыі: бабка Уляна, дзед Хведар, дзядькі Фадзей і Ціхан, сёстры Вера і Людміла, брат Фёдар, бацька і маці, якім, зазначае паэт, былі ўласцівы “працавітасць, сумленнасць, любасць да роднай зямлі”:

І паміж тых, кім сягоння
Славіцца наша сяло,
Думаю, што не апошнімі
Гэтыя людзі былі б.
Верны іх звычаю,
З сонцам
Я і сягоння ўстаю,
Хлеб крышыць асцерагаюся,
Дрэвы калечыць і цвет,
Камень прымаю з дарогі,
Пеўняў люблю, як пяюць,
Больш, як барометру, веру
Тысячам розных прыкмет [2, с. 216].

Прадстаўнікі роду Скурко – людзі працавітыя, сціплыя, простыя, шчырыя, мудрыя, добрыя, з пачуццём гумару, моцныя духам, высакародныя. Для кожнага з іх знаходзілася месца ў сэрцы паэта. Але найдаражэйшым на свеце чалавекам была для Максіма Танка маці – Домна Іванаўна. Працавітая і сціплая, набожная – “спаць не ляжа, пакуль за ўсіх не памоліцца”. Да маці ў яго былі асаблівыя пачуцці: складвалася такое ўражанне, што пупавіна, якой яны былі некалі злучаны, ніколі не разрывалася. Шчымліва гучаць радкі, прысвечаныя ёй: “Голас незнаёмага можа здзівіць, / Голас друга – на хвіліну

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спыніць, / Голас любай – сагрэць сонцам лета, / Голас маці вярнуць з таго свету” [1, с. 524].

Менавіта маці ўклала ў паэтава сэрца свае песні, і ён да канца жыцця “асцярожна, з хваляваннем” разматваў “клубок песень, каб хаця не парваць яе нітку”. Радзіма ў паэзіі Максіма Танка асацыіруецца з роднай песняй. Яна ўвасабляе духоўны пачатак жыцця чалавека, а менавіта – прыгажосць, красу, у тым ліку прыгажосць і красу Бацькаўшчыны. Максім Танк заўсёды на першае месца ставіў матэрыяльныя вытокі чалавечага жыцця (яны ў яго найчасцей акрэсліваюцца паняццем “хлеб”), але ніколі не забываўся і пра песню. Наогул, у яго творчасці, як правіла, “хлеб” і “песня” – карыснае і прыгожае – стаяць побач.

Радзіма – паняцце шырокае, яно ахоплівае ўсё пількаўскае наваколле: сінюю граду лясоў і забалочаныя сенажаці паміж рачулкамі Шыпаўкай і Краснаўкай, дзе Яўгену падлеткам прыходзілася трымаць у руках не толькі “трубу берасцяную”, але і касу, граблі, сякеру. Поруч многія ўрочышчы – Жукава, Краснаўка, Свінарка, Барсукі, Махнатка, Клецішча, Нявераўскае. Тут, у першароднай сувязі з бацькоўскай зямлёй, здабываліся і непрыкметна закладваліся “першаэлементы” танкаўскай паэзіі, рэчыўна важкія яе першаасновы, якія ўвесь час ад маладосці да сталасці пазначаць самабытнай і непаўторнай афарбоўкай паэтыку і стыль буйнога мастака слова. Больш таго: калі мы сёння гаворым аб тэндэнцыі прыцягнення зямных асноў, якую Танк творча сцвердзіў і трывала замацаваў у беларускай паэзіі, то яе вытокі, бясспрэчна, знаходзяцца тут, у краіне маленства і юнацтва, на родным мацерыку бацькоўскай зямлі, абходжанай, да крупінкі ўлюбёна агледжанай, выслуханай да кожнага шолаху і шэпту: “Пра кожнае дрэва і камень / Я ведаю столькі паданняў; / Пра кожную ў полі былінку / Ці голас птушыны ў бары, / Пра золкі ціхія, / Летнія поўдні, змярканні / Бясконцыя мог бы паэмы / Складаць, гаварыць” [2, с. 168].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І сапраўды, у творах Максіма Танка паўстаюць дарагія яму вобразы роднай зямлі: лясныя куткі, крыніцы, сенажаці, рэкі, аблокі, дарогу, “закалыханую жытам”; векавыя бронзавыя сосны, беластвольныя бярозы, кволыя кветачкі валошкі... Але найбольш любімы ў паэта вобраз дуба – сімвал магутнасці народа, яго духоўных каранёў, памяці. Для Максіма Танка ён яшчэ дарагі і таму, што гэтыя дрэвы растуць на бацькоўскай сядзібе:

На былым гумнішчы
Стаіць
Яшчэ бацькам пасаджаны
Дуб.
Не знаю,

Як мог выжыць ён,
Колькі раз яго
Гнулі вятры,
Сляпілі агнём бліскавіцы,
Секлі асколкі снарадаў,
Тапталі яму карані
Калёсы абозаў,
Падкутыя боты
Варожых салдат.
Я заўжды перад ім
Сваю шапку здымаю,
Бо з настаўнікаў,
Што зямлю
Вучылі любіць,
Толькі ён у мяне
І застаўся [1, с. 807].

Пра творчасць Максіма Танка, яго малую радзіму нам, землякам, можна гаварыць бясконца, бо мы неаднаразова праходзілі сцежкамі, па якіх басаною бегаў Яўген Скурко, сэрцам дакраналіся да таго, што было яму свята і дорага, як і ён, адчувалі прыцягненне родных каранёў, свет людзей, сярод якіх гадаваўся і мужнеў паэт, паступова спасцігаючы і асэнсоўваючы паняцце "Радзіма". Мы адкрылі для сябе, што немагчыма спасцігнуць вялікае, не зразумеўшы і не адчуўшы малога.

Літаратура

1. Танк, М. Збор твораў / М. Танк. – Мінск : Харвест, 2010. – 1008 с.
2. Танк, М. Лірыка / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 479 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ